# Слаўны шлях барацьбы і перамог

## (Да 40-годдзя ўтварэння Камуністычнай партыі Беларусі)

*К. Мазураў,*

*першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі*

Вялікі палітычны і працоўны ўздым перажывае наша краіна. 27 студзеня 1959 года ў Маскве адкрыецца нечарговы XXI з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, які распрацуе і зацвердзіць велічныя планы далейшага будаўніцтва камуністычнага грамадства ў СССР. Для працоўных Беларусі перажываемы момант асабліва радасны і знамянальны. 31 снежня гэтага года спаўняецца 40 гадоў Камуністычнай партыі Беларусі, а 1 студзеня 1959 года — 40 гадоў Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы.

Арганізатарам Камуністычнай партыі Беларусі і стваральнікам Беларускай Савецкай дзяржавы быў геніяльны настаўнік савецкага народа, заснавальнік і правадыр КПСС Уладзімір Ільіч Ленін. Яго мудрыя ўказанні адыгралі рашаючую ролю ў аб'яднанні бальшавіцкіх арганізацый Беларусі ў адзін з баявых атрадаў вялікай Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Цэнтральны Камітэт, У. І. Ленін натхнялі камуністаў і ўсіх працоўных Беларусі на абарону Савецкай улады ад замахаў знешніх і ўнутраных ворагаў, на барацьбу за ўмацаванне дыктатуры пралетарыята, за сацыялізм.

Вялікі і слаўны шлях прайшла Камуністычная партыя Беларусі за чатыры дзесяцігоддзі. У барацьбе за ўладу Саветаў, за трыумф сацыялізма і камунізма КПБ вырасла, загартавалася, набыла багацейшы вопыт палітычнага кіраўніцтва масамі, заслужыла бязмежную любоў і давер'е працоўных. КПБ кроўна звязана з народам і беззаветна служыць яго інтарэсам. Верная ўсёперамагаючаму сцягу марксізма-ленінізма, яна заўсёды вяла непрымірымую барацьбу супраць усякіх праяў апартунізма і рэвізіянізма, высока трымала сцяг партыйнасці і камуністычнай ідэйнасці, нястомна выхоўвала працоўных у духу пралетарскага інтэрнацыяналізма, умацоўвала дружбу беларускага народа з усімі народамі нашай краіны.

КПБ выступае як авангард беларускага народа, які будуе пад кіраўніцтвам КПСС, у брацкай садружнасці з усімі народамі СССР камуністычнае грамадства. Ва ўсёй сваёй дзейнасці КПБ кіруецца празорлівымі ўказаннямі ленінскага Цэнтральнага Камітэта, які з'яўляецца мазгом і сэрцам вялікай партыі камуністаў, усяго нашага гераічнага народа.

## Утварэнне Кампартыі Беларусі і барацьба за ўмацаванне Савецкай улады

Гісторыя Камуністычнай партыі Беларусі непарыўна звязана з гісторыяй слаўнай Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Кампартыя Беларусі была створана ў выніку аб'яднання бальшавіцкіх арганізацый, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі яшчэ з пачатку XX века. Гэтае аб'яднанне было падрыхтавана гістарычным развіццём рабочага руху і распаўсюджваннем марксізма ў Расіі, перамогай Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, няўхільным ажыццяўленнем ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Рэвалюцыйны рух працоўных Беларусі рос перш за ўсё пад уплывам рускага рэвалюцыйнага пралетарыята. У рускіх рабочых, у пралетарыяў Пецярбурга, Масквы і іншых індустрыяльных цэнтраў Расіі працоўныя Беларусі вучыліся бясстрашнасці і стойкасці ў барацьбе з царскім самадзяржаўем, з памешчыкамі і капіталістамі. У другой палавіне 90-х гадоў пад уплывам заснаванага Леніным Пецярбургскага «Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа» у Мінску, Віцебску, Гомелі, Гродна ўзнікаюць першыя марксісцкія гурткі і арганізацыі. У 1898 годзе ў Мінску адбыўся I з'езд РСДРП. Пазней у Беларусі, як і ў многіх іншых раёнах Расіі, паяўляюцца шматлікія іскраўскія групы, якія абуджалі ў рабочых масах класавую свядомасць, распаўсюджвалі бяссмертныя ідэі навуковага сацыялізма.

Пасля II з'езда РСДРП, які стварыў на ідэйных і арганізацыйных асновах, распрацаваных У. І. Леніным, бальшавіцкую партыю, іскраўскія групы ў Беларусі аформіліся ў арганізацыі Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. У 1903—1905 гадах у барацьбе з бундаўцамі і іншымі дробнабуржуазнымі нацыяналістычнымі і апартуністычнымі групамі былі створаны сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ў Мінску, Гомелі, Магілёве, Віцебску, Оршы, Бабруйску, Смаргоні і многіх іншых беларускіх гарадах і мястэчках. У пачатку 1904 года па ініцыятыве У. І. Леніна ЦК партыі стварыў у Беларусі два буйных партыйных цэнтры — Паўночна-Заходні і Палескі камітэты РСДРП.

Велізарнае значэнне для партыйных арганізацый Беларусі мела кіраўніцтва ЦК бальшавіцкай партыі і асабіста У. І. Леніна. Яго пісьмы ў партыйныя камітэты Беларусі і агентам ЦК гэтага раёна, яго геніяльныя працы, якія шырока распаўсюджваліся сярод працоўных, служылі для бальшавікоў пуцяводнай зоркай, асновай іх рэвалюцыйнай работы.

Сваю спеласць, згуртаванасць вакол ЦК партыі бальшавіцкія арганізацыі праявілі ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У барацьбе за перамогу пралетарскай рэвалюцыі бальшавікі ўлічвалі своеасаблівую абстаноўку ў краіне. Беларусь у пярэдадзень Кастрычніка з'яўлялася адным з рашаючых участкаў жорсткай палітычнай барацьбы, ад зыходу якой у значнай ступені залежаў поспех рэвалюцыі ў цэнтры Расіі. У Беларусі тады знаходзілася звыш паўтара мільёна салдат Заходняга фронта, вялікая колькасць кадравых рабочых з прамысловых цэнтраў краіны, мабілізаваных у армію, на ваенныя прадпрыемствы, расла шматтысячная армія мясцовага пралетарыята, які прайшоў пад кіраўніцтвам бальшавікоў суровую школу барацьбы з царызмам і капіталізмам, армія абяздоленых і даведзеных да галечы вайной беларускіх сялян. Усё гэта аблягчала падрыхтоўку і правядзенне сацыялістычнай рэвалюцыі. Але рэвалюцыйную мабілізацыю мас ускладнялі адносная

раздробленасць пралетарыята, абумоўленая эканамічнай адсталасцю Беларусі, дэзарганізатарская і раскольніцкая дзейнасць буржуазных нацыяналістаў.

Рэвалюцыйнаму фронту рабочых, сялян і салдат у Беларусі супрацьстаялі шматлікія контррэвалюцыйныя сілы: не толькі памешчыкі, капіталісты і іх прыхвасні — згодніцкія дробнабуржуазныя і нацыяналістычныя партыі, але і царскія афіцэры і генералы, армейскія і франтавы штабы, Стаўка вярхоўнага галоўнакамандавання з ваеннымі місіямі саюзных Расіі імперыялістычных дзяржаў, якія знаходзіліся пры ёй. Усе гэтыя рэакцыйныя сілы, падтрыманыя замежнымі імперыялістамі, імкнуліся ва што б там ні стала задушыць рэвалюцыйны рух працоўных.

Улічваючы гэтыя асаблівасці і кіруючыся Красавіцкімі тэзісамі У. І. Леніна і рашэннямі VI з'езда партыі, бальшавікі Беларусі бязлітасна выкрывалі антынародную палітыку буржуазнага Часовага ўрада, здрадніцкую ролю меншавікоў, эсэраў, беларускіх і яўрэйскіх буржуазных нацыяналістаў. Бальшавікі нястомна выхоўвалі масы ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізма і дружбы народаў, згуртоўвалі працоўных вакол пралетарыята, умацоўвалі саюз рабочага класа з бяднейшым сялянствам, разам з усёй партыяй рыхтавалі палітычную армію, неабходную для рашаючага штурму капітала. У ходзе рэвалюцыйнай барацьбы бальшавіцкія арганізацыі Беларусі, як і ўся наша партыя, ідэйна загартаваліся і арганізацыйна ўмацаваліся.

Энергічную дзейнасць па згуртаванню рабочых, працоўных сялян Беларусі і салдат Заходняга фронта вакол бальшавіцкай партыі праводзілі М. В. Фрунзе, А. Ф. Мяснікоў, П. Н. Лепяшынскі, В. Г. Кнорын, І. Я. Алібегаў, М. М. Хатаевіч, М. І. Крывашэін, К. І. Ландэр, С. Г. Магілеўскі, В. С. Селязнёў, В. В. Фамін, В. В. Каменшчыкаў, М. В. Рагозінскі і многія іншыя відныя работнікі партыі.

З развіццём рэвалюцыі ў бальшавіцкіх арганізацыях Беларусі расло імкненне да кансалідацыі сваіх радоў, да стварэння адзінага партыйнага цэнтра. Пад кіраўніцтвам ЦК на першай Паўночна-Заходняй абласной і франтавой канферэнцыі РСДРП(б), якая адбылася 15—18 верасня 1917 года, быў створан Паўночна-Заходні абласны камітэт партыі. Утварэнне гэтага камітэта для кіраўніцтва партыйнымі арганізацыямі Беларусі і Заходняга фронта з'явілася важным этапам на шляху стварэння Камуністычнай партыі Беларусі.

Савецкая ўлада ў Беларусі перамагла адначасова з устанаўленнем яе ў цэнтральных раёнах краіны. У Мінску яна зацвердзілася 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 года. Да сярэдзіны лістапада савецкімі сталі Гомель, Віцебск, Магілёў, Орша, Полацк і іншыя гарады — уся не акупіраваная нямецкімі імперыялістамі тэрыторыя.

Станаўленне Савецкай улады адбывалася ў жорсткай барацьбе з меншавікамі, эсэрамі, беларускімі, яўрэйскімі і іншымі буржуазнымі нацыяналістамі, якія падтрымлівалі сілы рэакцыі. Бальшавікамі былі разгромлены такія контррэвалюцыйныя цэнтры, як Стаўка вярхоўнага галоўнакамандавання, так званы нацыянальны ўсебеларускі кангрэс, белагвардзейскі конны корпус Даўбор-Мусніцкага.

З першых жа дзён маладой Савецкай рэспублікі Камуністычная партыя прыступіла да дзяржаўнага ўстройства вызваленых народаў. У пачатку снежня 1917 года Цэнтральны Камітэт РКП(б), улічваючы спадзяванні і імкненні беларускага народа, паставіў пытанне аб стварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Напад на Савецкую Расію нямецкіх імперыялістаў і часовая акупацыя Беларусі кайзераўскімі войскамі перапынілі работу па стварэнню БССР. Па

закліку партыі працоўныя Беларусі разам з усім савецкім народам узняліся на абарону заваёў Вялікага Кастрычніка.

Выгнанне нямецкіх захопнікаў дазволіла завяршыць дзяржаўнае ўстройства беларускага народа. 30 снежня 1918 года ў Смаленску па ініцыятыве Цэнтральнага Камітэта партыі сабралася VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б). Яна прыняла рашэнне аб утварэнні БССР і сфарміравала Часовы рабоча-сялянскі ўрад. 1 студзеня 1919 года ўрад абнародаваў маніфест аб утварэнні Беларускай ССР. Гэты дзень і стаў днём нараджэння суверэннай нацыянальнай Беларускай Савецкай дзяржавы.

VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б) абвясціла сябе Першым з'ездам Кампартыі Беларусі. У аснову сваёй дзейнасці яна паклала вучэнне марксізма-ленінізма, ленінскія ідэалагічныя, арганізацыйныя і тактычныя прынцыпы; праграма і Статут РКП(б) былі адначасова праграмай і Статутам КП(б)Б.

Утварэнне КПБ, як і кампартый усіх нацыянальных рэспублік, з'явілася новым этапам у будаўніцтве Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, трыумфам ленінскай нацыянальнай палітыкі, развіццём дзяржаўнага суверэнітэта раней прыгнечаных і залежных народаў былой царскай Расіі.

У тэлеграме Цэнтральнаму Камітэту РКП(б) Першы з'езд КПБ пісаў: **«З'езд пацвярджае сваю непарыўную ідэйную, тактычную і арганізацыйную сувязь з Расійскай Камуністычнай партыяй, якая стваралася доўгімі гадамі сумеснай работы. З'езд пацвярджае, што камуністы Беларусі і надалей будуць цалкам кіравацца дырэктывамі ЦК РКП, лічачы яго сваім вышэйшым партыйным органам».**

Гістарычнае значэнне Першага з'езда Кампартыі Беларусі заключаецца ў тым, што ён абвясціў утварэнне БССР, аб'яднаў у адно бальшавіцкія арганізацыі і стварыў Кампартыю Беларусі як частку РКП(б), мабілізаваў камуністаў і ўсіх працоўных рэспублікі на барацьбу супраць унутранай і знешняй контррэвалюцыі, за ўмацаванне Савецкай улады, умацаванне дружбы беларускага народа з вялікім рускім і іншымі народамі нашай краіны, на барацьбу за сацыялізм. «Толькі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, — гаварылася ў Звароце Першага з'езда да рабочых, усіх працоўных рэспублікі, — вы не на словах, а на справе прыдзеце да сацыялізма».

Шмат бядот абрушылася на рэспубліку ў час грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі. У 1918 годзе яе тэрыторыя падверглася спусташальнай акупацыі кайзераўскіх войск, а ў 1919—1920 гадах — польскіх імперыялістычных захопнікаў. У гарадах і сёлах Беларусі ўстанаўліваўся рэжым грабяжу, насілля і зняваг над рабочымі і працоўнымі сялянамі. Акупантам актыўна дапамагалі заклятыя ворагі народа — беларускія буржуазныя нацыяналісты. Крывадушна прыкрываючыся лозунгам нацыянальнай свабоды, барацьбы за «самастойную Беларусь», яны імкнуліся падарваць адзінства беларускага і рускага народаў, прадавалі Беларусь оптам і ў розніцу капіталістычным драпежнікам.

Камуністычная партыя Беларусі пад кіраўніцтвам ЦК РКП(б) выступіла арганізатарам усенароднай барацьбы супраць акупантаў і ўнутранай контррэвалюцыі. Партыя стварала падпольныя арганізацыі, раздувала ў тылу акупантаў полымя партызанскай вайны, узнімала на паўстанне сялян, кіравала забастоўкамі рабочых. Дзесяткі тысяч дабраахвотнікаў-беларусаў пайшлі ў Чырвоную Армію. У першых радах байцоў за Савецкую ўладу былі камуністы і камсамольцы.

Перамога над інтэрвентамі і белагвардзейцамі была дасягнута аб'яднанымі намаганнямі савецкіх народаў пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі. Сусветны імперыялізм пацярпеў буйнейшае ваеннае і палітычнае паражэнне. Савецкая ж дзяржава прадэманстравала сваю вялікую жыццёвую сілу.

## Кампартыя Беларусі ў барацьбе за пабудову сацыялізма

Да Вялікага Кастрычніка Беларусь уяўляла сабой адну з адсталых нацыянальных ускраін царскай Расіі. Імперыялістычная палітыка самадзяржаўя, палітыка прыгнечання нярускіх нацыянальнасцей тармазіла развіццё прадукцыйных сіл і культуры беларускага народа. У краі мала было металаапрацоўчых заводаў, пераважалі невялікія прадпрыемствы вінакурнай, харчовай і гарбарнай прамысловасці, падпарадкаваныя некалькім манапалістычным аб'яднанням.

Жабрацкай, бязрадаснай і беспрасветнай была беларуская вёска. Да рэвалюцыі сяляне ў большасці сваёй былі пазбаўлены зямлі; больш 60 працэнтаў яе належала памешчыкам, царкве, казне і г. д. На долю ж сялян прыходзілася ўсяго 35 працэнтаў зямлі, прытым самай горшай. Бяднейшыя сяляне, батракі (у вёсцы яны складалі 67 працэнтаў) былі задушаны адпрацоўкамі, кабальнай арэндай і ўсялякімі плацяжамі. Большая частка сялян не мела кавалка хлеба, жыла ўпрогаладзь, харчуючыся лебядой, мякінай, драўнянай карой. Гэтае паўгалоднае, беспрасветнае жыццё выяўлялася нават у назвах вёсак: Бясхлебіцы, Мохаеды, Караеды, Глухавічы, Залатуха і да т. п.

У дарэвалюцыйнай Беларусі не было ніводнай вышэйшай навучальнай установы, ніводнай буйнай публічнай бібліятэкі. Нацыянальную мову кіруючыя класы лічылі «халопскай», «мужыцкай», кнігі і газеты на ёй не выдаваліся.

Народны паэт Якуб Колас многа пазней з глыбокім болем у сэрцы пісаў:

Колькі талентаў звялося,
Колькі іх і дзе ляжыць
Невядомых, непрызнаных,
Неаплаканых нікім,
Толькі ў полі адспяваных
Ветру посвістам пустым.

Кастрычніцкая рэвалюцыя выклікала да жыцця творчыя сілы народа і вывела працоўных на шлях будаўніцтва сацыялізма. У. І. Ленін распрацаваў навукова-абгрунтаваную праграму пераўтварэння эканамічна адсталай Расіі ў перадавую сацыялістычную дзяржаву. Вялікім трыумфам ленінскай нацыянальнай палітыкі з'явілася ўтварэнне Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Працоўныя Беларусі аднымі з першых горача ўхвалілі і падтрымалі ідэю Леніна аб стварэнні адзінай шматнацыянальнай Савецкай дзяржавы. Камуністычная партыя Беларусі, верная прынцыпам пралетарскага інтэрнацыяналізма, узначаліла рух беларускага народа за стварэнне СССР.

Уступленне Беларусі ў склад СССР умацавала яе дзяржаўны суверэнітэт, мела рашаючае значэнне для развіцця яе эканомікі і культуры. Толькі ў саюзе з брацкімі рэспублікамі беларускі народ паспяхова пераадолеў цяжкасці, выкліканыя імперыялістычнай і грамадзянскай войнамі, і да канца 1925 года ў асноўным завяршыў аднаўленне сваёй народнай гаспадаркі. Беларускі народ ніколі не забудзе вялікадушнасці і бескарыснай дапамогі працоўных Расійскай Федэрацыі, якія ў самыя

цяжкія гады вылучылі са сваіх мізэрных запасаў грашовыя сродкі, сыравіну і абсталяванне для прамысловасці, сельскагаспадарчы інвентар і насенне, каб засеяць пустуючыя палі.

Здзяйсняючы ленінскія прадвызначэнні, выконваючы рашэнні XIV з'езда ВКП(б), Кампартыя Беларусі мабілізавала працоўных на барацьбу за ажыццяўленне генеральнай лініі партыі на індустрыялізацыю краіны. Велізарныя маштабы сацыялістычнай індустрыялізацыі, хуткія яе тэмпы пры слабай вытворчай базе, недахопе кадраў і сродкаў запатрабавалі ад камуністаў, усіх працоўных найвялікшай энергіі і самаадданасці. Рабочыя і сяляне праяўлялі сапраўдны працоўны гераізм і вялікую стойкасць, свядома ішлі на ахвяры і сур'ёзныя самаабмежаванні ў імя вялікай мэты — ператварэння краіны ў магутную індустрыяльную дзяржаву. Камуністы знаходзіліся ў першых радах стваральнікаў буйной індустрыі. Яны ўзначалілі барацьбу рабочага класа супраць лішкаў і непрадукцыйных выдаткаў, за найстражэйшы рэжым эканоміі, беражлівае выкарыстанне матэрыяльных і грашовых сродкаў, няспыннае павышэнне прадукцыйнасці працы, за авалоданне тэхнікай. Вялікую дапамогу ў сацыялістычнай індустрыялізацыі БССР аказалі рускі, украінскі і іншыя народы. З Масквы і Ленінграда, з Урала і Данбаса рэспубліка атрымлівала неабходныя матэрыялы і абсталяванне. З гэтых індустрыяльных цэнтраў у Беларусь было накіравана немала высокакваліфікаваных спецыялістаў. З агульнасаюзнага бюджэта паступала значная частка сродкаў на прамысловае будаўніцтва.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы